**УДК 94(476):72(091)**

# ШЛЯХЕЦКІЯ МАЁНТКІ ЛЕПЕЛЬШЧЫНЫ: СУЧАСНЫ СТАН, ПРАБЛЕМЫ ЗАХАВАННЯ І АДНАЎЛЕННЯ

***Н.А. МІЗЯРСКА***
***(Прадстаўлена: канд. гіст. навук, дац. У.А. ЛОБАЧ)***

*Аўтар уздымае праблему вывучэння і захавання важнага сегмента гісторыка-культурнай спадчыны беларусаў – шляхецкіх маёнткаў у рамках лакальнага культурнага ландшафту Лепельшчыны. Даследаванне заяўленай праблематыкі праводзіцца, як у сінхроннай, так і дыяхроннай перспектыве, што дазваляе прасачыць шмат у чым трагічны лёс шляхецкіх маёнткаў на працягу XX ст. і іх актуальны стан у незалежнай Беларусі.*

Віцебская вобласць валодае значным патэнцыялам для развіцця турызму і налічвае больш за 3000 помнікаў археалогіі, архітэктуры, гісторыі, мастацтва і культуры. Каля 1000 аб’ектаў занесены ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь [12].

З 330 шляхецкіх палацава-паркавых комплексаў былога Лепельскага павета засталася толькі нязначная частка, большасць якіх на сёняшні час знаходзяцца ў занядбаным стане. У прыдатных для выкарыстання будынках размяшчаюцца аб'екты сацыяльна-культурнага прызначэння: школы, медыцынскія ўстановы, крамы, склады.

У г.п. Бешанковічы ў галоўным корпусе былога палаца Храптовічаў зараз размяшчаецца дзіцячая школа мастацтваў, у аранжарэі гэтага палаца – Бешанковіцкі аддзел Дэпартамента аховы. За кошт дзяржавы рамантуюцца флігелі маёнтка. Палацава-паркавы комплекс з’яўляецца аб'ектам гісторыка-культурнай спадчыны рэспубліканскага значэння 2 катэгорыі [1, с. 143]. У пейзажным парку бешанковіцкага маёнтка яшчэ зберагліся некаторыя алеі, дзе растуць старыя дубы і лістоўніцы. Ад старажытнага дуба Напалеона, пад якім, па мясцоваму паданню, у 1812 г. французскі імператар Напалеон I пазіраваў мастаку, застаўся толькі адзін ствол. Аб гэтым успамінае мясцовы краязнаўца Леаненка С.П.: “Этому дубу было около 400 лет, а высота его достигала примерно 30 метров. Дерево росло в былом парке Хрептовича и являлось историко-культурной ценностью республиканского значения 2 категории. Ранее дуб был огорожен забором и имел шильду. Значит, не так давно рядом с деревом проложили теплотрассу, из-за чего некоторе ветки дерева стали усыхать. Засохшие ветви спилили, и дерево летом имело довольно здоровую и пышную крону. Потом, благодаря настойчивости учителей, что якобы дерево может упасть на территорию школы, дерево без всяких раздумий спилили. Обидно, что так ха-латно у нас относятся ко всему люди” [6].

На тэрыторыі бешанковіцкага парка засталіся яшчэ да нашых дзён і дзве заросшыя сажалкі: «пруд закаханых» і «графскі пруд». Па словах Леаненка С.П. вядома, што ў парку хацелі зрабіць фантан: «Недавно, лет 5 назад, здесь хотели делать фонтан, и поставили насос, который забивался травой, которая произрастает в пруду. Вот как бывает, давным-давно людям было известно, как строить дворцы, парки и пруды, а сейчас в XXI веке не могут возобновить то, что было столетиями ранее» [6].

У Двор Нізгалава Бешанковіцкага раёна да сёняшняга часу збераглася сядзіба Мядзведскіх. У прыгодным стане знаходзяцца флігель, кухня, кузня, вяндлярня і гаспадарчыя пабудовы. Сядзіба разам з іншымі будынкамі з’яўляецца аб’ектам гісторыка-культурнай спадчыны рэспубліканскага значэння 2 катэгорыі [1, с. 143]. З 2012 г. у сядзібным будынку размяшчалася школа, якую пазней закрылі. Пасля планавалі стварыць тут музей і бібліятэку, але мясцовыя ўлады палічылі, што гэта будзе дорага каштаваць – і на будынак вырашылі павесіць замок. Былая сядзіба на сёняшні час выглядае нядрэнна, але з цягам часу пачынае разбурацца. У парку сядзібнага комплекса Двор Нізгалава яшчэ захаваліся тэрасы і старыя высокія дрэвы. Тут расце шмат унікальных дэкаратыўных раслін: аксаміты, піхты, веймунтавыя сосны ва ўзросце больш за 100 год, лістоўніцы еўрапейскія, ліпы, бярозы, дубы, коркавае дрэва [15, с. 99–100].

Упершыню магчымасць продажу дзяржаўнай маёмасці за адну базавую велічыню беларускім прадпрымальнікам была прадастаўлена ў 2007 годзе Указам № 108 Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь [14]. Мясцовыя ўлады Віцебскай вобласці таксама спрабуюць знайсці гаспадароў для такіх будынкаў, і некаторыя сядзібы выстаўляюцца на аўкцыён. Так, па словах Леаненка С.П. вядома, што: “Усадебный дом в Низголово с постройками выставлялись на аукцион-продажу два раза, во втором аукционе начальная цена продажи была снижена на 20%. Ну, а теперь, если кто купит за 1 базовую величину, то будет замечательно” [6].

Былая сядзіба Маліноўскіх у Чарапоўшчыне Ушацкага раёна, якая не ахоўвалася дзяржавай, згарэла 9 мая 2014 г. па незразумелых прычынах, аб чым успамінаюць мясцовыя жыхары: «В усадьбу

в Череповщине приобрела грузинская частная фирма «Ленго-Вест», которая разорилась впоследствии. Частный предприниматель из Ушачи купил этот дом за символическую цену, застраховал, а в 2014 г. эта усадьба сгорела при странных обстоятельствах» [4]. Ад былой сядзібы ў Чарапоўшчыне пасля пажару застаўся толькі склеп, лядоўня і рэшткі сядзібы. Па словах мясцовага жыхара Марозава У.В., канюшню тым жа летам 2014 г. разабралі на дровы [7].

Ва Ушачах былы млын графа Плятэра на сёняшні дзень знаходзіцца ў аварыйным стане і не ахоўвацца дзяржавай. Ад былой сядзібы графа застаўся толькі фундамент, на якім у савецкія часы быў пабудаваны драўляны дом.

Былая сядзіба Ваньковічаў, якая знаходзіцца непадалёку ад вёскі Вялікія Дольцы Ушацкага раёна (зараз вёска Новае жыццё), знаходзіцца ў разбураным становішчы і не ахоўваецца дзяржавай. Ад былога маёнтка Двор Жары, які прыналежыў пану Грагаровічу, засталася толькі заросшая сажалка, падмурак былой сядзібы і старажытны парк [9]. У Двор Пліна ад панскага маёнтка засталося некалькі гаспадарчых пабудоў і рэшткі парка.

У занядбаным стане знаходзіцца ў в. Арэхаўна былая сядзіба Грабніцкіх. Па словах намесніка загадчыка аддзела ідэалагічнай работы, культуры, па справах моладзі Ушацкага райвыканкама Шэўчанка Марыі Аляксееўны вядома: «Бывшая усадьба в Ореховно не используется с 1998 г. и включена в перечень неиспользуемого и неэффективно используемоо имущества, находящегося в собственности Витебской области и её административно-территориальных единиц. До 2013 г. усадьба находилась на консервации. В настоящее время данная постройка – объект отчуждения путём продажи на аукционе, который проводит Витебский областной территориальный фонд государственного имущества. Усадьба в Ореховно внесена в список историко-культурных ценностей Республики Беларусь и относится к 3 ка-тегории» [10].

У былой вінакурні памешчыка Навацкага ў Фролкавічах у савецкі час быў сушыльны завод, які зачынілі ў 1990-х гг. Зараз толькі рэшткі напамінаюць аб тым, што тут некалі існаваў маёнтак [6].

Былая сядзіба Лісоўскіх у Блізніцы захавалася ў добрым стане, там зараз размяшчаецца дом культуры і дзяцячая школа мастацтваў. Збярогся таксама і парк са старажытнымі дрэвамі.

Да нашых дзён ад былога палаца Валадковічаў у Іванску застаўся кавалак сцяны і флігель, які паступова разбураецца. Некалі прыгожы парк зарастае і губляе сваё першапачатковае аблічча. Усё астатняе было знішчана ў савецкія часы 1950-1970 гг. [3, с. 38]. З 1990-х гадоў была прадстаўлена магчымасць для развіцця ўласнага прадпрымальніцтва, і, нярэдка, выкупляліся пабудовы былых маёнткаў. Прадпрымальнік з Мінска ў сярэдзіне 90-х гадоў выкупіў напаўразбураны флігель у Іванску, перакрыў дах, уставіў рамы і зашкліў вокны, распачаў іншыя аднаўленчыя работы, спадзяваючыся зрабіць у былым флігелі краму і кафэ, а таксама жыллё для сваёй сям'і. Але справы ў яго не заладзіліся, і ён пакінуў Іванск, так і не скончыўшы добрую справу. А флігель зноў прыйшоў у заняпад [3, с. 39].

Альжбэта Валадковіч (па мужу Мараўская), унучка Вінцэнта Валадковіча, у маі 2010 г. разам з сынам Робертам і дачкой Ізабэлай прыехалі ў Чашніцкі раён з Варшавы, каб наведаць папяровую фабрыку. Нашчадкі завіталі і ў Іванск паглядзець на рэшткі былога палацава-паркавага ансамбля сваіх продкаў. Для гасцей быў арганізаваны цёплы прыём і экскурсія, якая распачалася з выканання на цымбалах "Паланеза Агінскага", які замест "развітання з Радзімай", з'явіўся сімвалам вяртання на сваю радзіму. Аўтар гісторыка-краязнаўчага нарыса "Іванск і ваколіцы", Віктар Грыбко, апісаў сустрэчу з нашчадкамі Валадковічаў: "Не магу забыць, як пані Альжбэта дрыжачай рукой гладзіла рэшткі сцяны былога палаца, дзе жылі яе продкі, як пад праліўным дажджом укленчыла на месцы, дзе была радавая ўсыпальніца-капліца, ад якой застаўся толькі адзін надмагільны камень. І так балюча і сорамна стала за тое, што нарабілі людзі…" [3, с. 43].

Ветрынская школа-інтэрнат да сёняшняга часу размяшчаецца ў былой сядзібе Козел-Паклеўскіх (в. Быкаўшчына Полацкага раёна). Маёнтак у культурна-гістарычнай спадчыне займае асобнае месца. Сядзіба, флігелі, гаспадарчыя пабудовы, падземная частка фамільнага склепа, парк, ставы, алея ўзяты пад ахову дзяржавы, як помнік 3 катэгорыі архітэктуры і паркавай гаспадаркі XIX стагоддзя [1, с. 143]. Апрача сядзібнага будынку, школы і флігеля, збярагліся ўсе гаспадарчыя пабудовы, што былі ўзведзены пры старым гаспадары. Некаторыя х іх знаходзяцца ў аварыйным становішчы [11, с. 12–13]. У двух верхніх ярусах склепа, якія засталіся ад былой капліцы-пахавальні Козел-Паклеўскіх, у 2009 г. размяшчаўся склад гаруча-змазачных матэрыялаў [2].

Былая сядзіба ў Бяздзедавічах Рымскага-Корсакава, сваяка вядомага кампазітара, захавалася ў добрым стане. Зараз тут размяшчаецца бальніца сястрынскага догляду. Яшчэ захаваўся парк з таполямі, ліпамі, сажалкамі і каналамі. Свята - Іверскую царкву ў Бядзедавічах, якую фундаваў Рымскі-Корсакаў, адрамантавалі ў 1990-х гг. Царква перададзена епархіі і ахоўваецца дзяржавай.

Парк "Саломінка" у в. Дабрыгоры Бешанковіцкага раёна, які быў закладзены ваенным урачом П.М. Красавіцкім у 1906 г., на сёняшні момант з'яўляецца помнікам 3 катэгорыі і ахоўваецца дзяржавай [1, с. 142]. У парку да нашых часоў збярагліся алеі з лістоўніц і ліп. Парк у 2013 г. знаходзіўся ў занядбаным стане: у цэнтры парка стаялі рэшткі былога дзяцячага сада калгаса " Савецкая Беларусія". Некалі

цудоўны парк зарос, яго забрудзілі смеццем [13]. Па словах Леаненка С.П. на сёняшні момант справа выглядае так: "Парк в Дабрыгорах был конечно в ужасном состоянии, по этому поводу много люди писали, призывая местные власти помочь навести порядок. На сегодня, значит, убрали разрушеные строения, организуются субботники, охранная шильда висит. Но можно было бы и памятник создателю парка поставить, чтобы было что детишкам и туристам показать" [6].

Ад былога Бачэйкаўскага маёнтка на сёняшні час застаўся флігель і рэшткі некалі славутага парка. Вядома, што раней у флігелі па прапанове апошняга нашчадка з Цеханавецкіх хацелі зрабіць музей, але пакуль што гэта справа засталася нерэалізаванай [8].

Паміж простым чалавекам і шляхцічам заўсёды існаваў бар'ер, што адлюстравалася на псіхалагічным узроўні ў паданнях і легендах. Месцы былых маёнткаў амаль заўсёды разглядаліся, як небяспечныя. Гэты былі месцы схованых скарбаў, прывідаў і сувязі з нячыстай сілай. Такім месцам з'яўляецца, па словах Колычавай Л.М., былы маёнтак Лісоўскіх у в. Блізніца:" Около здания школы часто видят некую женщину в белом в образе неясного силуэта; слышат как в пустых классах играет некто на фортепиано фальшивую классическую музыку, иногда слышны чьи-то шаги и дыхание за спиной, кто-то в пустом помещении начинает передвигать мебель» [5]. Усе гэтыя падзеі звязваюць з паненкай, якая некалі скочыла жыццё самагубствам. Згодна з паданнем, дачка пана Лісоўскага закахалася ў чалавека простага саслоўя і хацела выйсці замуж за яго. Але пан раззлаваўся і не даў згоды на вяселле, пасля чаго дачка ўтапілася ў сажалцы каля сядзбы. Пахавалі яе ў весцы Заскаркі на каталіцкіх могілках для простых людзей. Былую сядзібу Лісоўскіх, па словах загадчыцы дома культуры, часта наведваюць госці, дзякуючы гэтым прывідам: «Ой, у нас же здесь свадьбы приезжают, фотографии делают. Одно, что местность красивая, а другое, что вот эти приведения…» [5].

У Полацкім раёне на месце былога маёнтка Арэхаўна, які прыналежыў шляхцічам Забелам, на сёняшні дзень засталіся рэшткі парка і склеп ад былой сядзібы. У вёсцы Селішчы засталіся толькі гаспадарчыя пабудовы ад былога фальварка.

На сёняшні дзень нашчадкі былой шляхты Лепельскага павета жывуць у розных кутках свету. Анжэй Рэйман (з старэйшай лініі роду Грабніцкіх) і Кінга Ухрыноўская (з малодшай лініі) жывуць у Варшаве (Польша). А. Рэйман, вядомы польскі кампазітар, мае прыватны архіў сваіх продкаў і збіраецца ў гэтым годзе наведаць Беларусь, былы маёнтак Грабніцкіх, царкву ў Арэхаўне, якую фундаваў прадзед Кінгі Ухрыноўскай, Мікалай Грабніцкі. Антаніна Грыцэнка, якая жыве у Расіі, з'яўляецца праўнучкай Лісоўскіх, мае вялікі архіў аб сваіх продках. Нашчадкі вялікага і разгалінаванага роду Плятэраў, якія некалькі гадоў таму назад наведалі Беларусь, жывуць у Германіі і Францыі.

Да нашага часу з некалі велічных палацава-паркавых комплексаў былога Лепельскага павета захавалася толькі нязначная частка: сядзіба і парк Лісоўскіх у Варонічах, сядзіба і парк Храптовічаў у Бешанковічах, маёнтак Мядзвецкіх у Двор Нізгалаве Бешанковіцкага раёна, флігель і рэшткі парка ў Бачэйкаве Бешанковіцкага раёна, сядзіба Рымскага-Корсакава ў Бядзедавічах і сядзіба Козел-Паклеўскіх у Быкаўшчыне Полацкага раёна. Многія сядзібы знаходзяцца ў аварыйным стане і патрабуюць кансервацыі і рамонту: сядзіба ў в. Новае Жыццё Ушацкага раёна, сядзіба ў Арэхаўна, памяшканне склепа сядзібы Маліноўскіх у Чарапоўшчыне, млын графа Плятэра ва Ушачах. Некаторыя помнікі палацава-паркавай архітэктуры на сёняшні дзень унесены ў дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі (Бешанковічы, Двор Нізгалава, Бачэйкава, Быкаўшчына). Астатнія ж помнікі пакуль што не ахоўваюцца дзяржавай (Чарапоўшчына, Блізніца, в. Новае Жыццё Ушацкага раёна).

У нашай краіне, у сувязі з недахопам фінансавых сродкаў і абыякавасцю людзей да свайго мінулага, існуе вострая праблема па захаванню гісторыка-культурнай спадчыны. Некаторыя сядзібы Лепельшчыны не раз выстаўляліся на аўкцыён-продаж, з мэтай адшукаць надзейнага гаспадара, які б садзейнічаў аднаўленню архітэктурнага помніка, але пакуль што добрых вынікаў гэтая ідэя не прынесла.

Такім чынам, для захавання застаўшайся гісторыка-культурнай спадчаны былога Лепельскага павета можна пайсці рознымі шляхамі: па-першае, прыцягнуць дарослае насельніцтва і моладзь да шанавання сваёй гісторыі, адказнасці за парадак у прысядзібных парках і на могілках; па-другое, наладзіць кантакты з былымі нашчадкамі шляхты за мяжой, якія маглі б спрыяць аднаўленню палацаў і паркаў, а таксама, перадаць каштоўныя архіўныя матэрыялы аб сваіх продках; па-трэцяе, у сядзібных будынках, прыгодных для эксплуатацыі – стварыць дамы-музеі, дзе б маглі праводзіцца экскурсіі, навукова-практычныя канферэнцыі з удзелам вядомых навукоўцаў і гасцей.

ЛІТАРАТУРА

1. Абламскі, В. Я. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь / В. Я. Абламскі, І. М. Чарняўскі, Ю. А. Барысюк. – Мінск : БЕЛТА, 2009. – 684 с.
2. Амосаў, У. Залатаносны участак Полаччыны [Электронны рэсурс] / Westki.info. Навіны паўночнай

Беларусі і Вільні. – Рэжым доступа: http://westki.info/blogs/8553/zalatanosny-uchastak-polachchyny – Дата доступа: 20.02.2017.
3. Грыбко, В. В. Іванск і ваколіцы: гісторыка-краязнаўчы нарыс / В. Грыбко. – Мінск : Медысонт, 2011. – 124 с.
4. Зап. Мізярска Н. А. у 2017 г. ад Іванова Алега Барысавіча, 1962 г.н. у г.п. Ушачы.
5. Зап. Мізярска Н. А. у 2016 г. ад Колычавай Лідзіі Міхайлаўны, 1951 г.н. у в. Блізніца Полацкага р-на.
6. Зап. Мізярска Н. А. у 2016 г. ад Леаненка Станіслава Пятровіча, 1970 г.н. у г.п. Бешанковічы.
7. Зап. Мізярска Н .А. у 2016 г. ад Марозава Уладзіміра Васільевіча, 1936 г.н. у в. Чарапоўшчына Ушацкага р-на.
8. Зап. Мізярска Н. А. у 2016 г. ад Петрачэнка Міхаіла Васільевіча, 1926 г.н. у в. Бачэйкава Бешанковіцкага р-на.
9. Зап. Мізярска Н. А. у 2016 г. ад Піскун Ніны Міхайлаўны, 1955 г.н. у в. Вялікія Дольцы Ушацкага р-на.
10. Зап. Мізярска Н. А. у 2016 г. ад Шэўчанка Марыі Аляксееўны, 1974 г.н. у г.п. Ушачы Віцебскай вобласці.
11. Платонова, Р. М. Историческая усадьба Поклевских-Козелл / Р. М. Платонова, М. З. Соловьёва, М. А. Платонова // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. F. Стр-во. Приклад. науки. – 2013. – № 8. – С. 10–14.
12. Спорт і турызм [Электронны ресурс] / Сайт упраўлення спорту і турызму Віцебскага аблвыканкама.– Рэжым доступа: http://www.vitebsk-region.gov.by/pda/by/sport-i-turyzm/. – Дата доступа: 03.01.2017.
13. Станкевич, Г. Уничтоженная «Соломинка» [Электронный ресурс] / beshankovichy.by Информационный портал. – Режим доступа: http://beshankovichy.by/rus. – Дата доступа: 01.02. 2017.
14. Старинную усадьбу можно будет купить за одну базовую величину [Электронны ресурс] / Недвижимость на REALT.BY – Рэжым доступа: https://realt.by/news/article/10506/. – Дата доступа: 26.02.2017.
15. Федорук, А. Т. Садово-паркое искусство Белорусии / А. Т. Федорук. – Минск : Ураджай, 1989. – 247 с.